УДК 902.2 (476)

# ДАСЯГНЕННІ АРХЕАЛАГІЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ТАПАГРАФІІ СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА

***Ю. У. Врублеўскі,***
*кандыдат гістарычных навк, дацэнт,*
*загадчык кафедры сацыяльнай работы*
*ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны*
*педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"*

У артыкуле прадстаўлены вынікі археалагічнага вывучэння структурных адзінак раннесярэдневяковага Полацка. Высвятляецца ўклад беларускіх гісторыкаў у вывучэнне пытанняў гістарычнай тапаграфіі Полацка. Асвятляюцца дасягненні беларускай археалогіі па вывучэнні тэрытарыяльнай структуры раннесярэдневяковага Полацка.

*Ключавыя словы:* гарадзішча, Верхні замак, Ніжні замак, Запалоцкі псасд, гістарычная тапаграфія, археелагічныя даследаванні.

# ACHIEVEMENTS OF ARCHAEOLOGICAL STUDY OF HISTORICAL TOPOGRAPHY OF ANCIENT POLATSK

The article presents the results of archeological study of structural units of early medieval Polotsk. The contribution of Belarusian historians to the study of the historical topography of Polotsk is clarified. The achievements of Belarusian archeology in studying the territorial structure of early medieval Polotsk are covered.

*Key words:* ancient settlement, Upper castle, Lower castle, Zapolotskyi pasad, historical topography, archeological researches.

Навуковы характар археалагічныя даследаванні גарадоў набылі ў гістарычнай навуцы Беларускай ССР з другой паловы 1920-х гг. У гэты час былі наладжаны археалагічныя раскопкі гарадоў Полацкай зямлі. Адным з найбольш даследаваных помнікаў з'яўляецца Полацк.

Сучасны Полацк, горад, цэнтр Полацкага раёна на р. Зах. Дзвіна пры ўпадзенні ў яе р. Палата. Знаходзіцца за 100 км ад. Віцебска, вузел чыгунак і аўтадарог. Адзін з самых старажытных гарадоў усходніх славян . Упершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 годам . У сучасным Полацку зараз складваецца школа падрыхтоўкі археолагаў, якой кіруе Дук Д.У.

Вывучэнне асобных тапаграфічных адзінак Полацка мае багатую гістарыяграфічную традыцыю і звязана з выдатнымі адкрыццямі гісторыі раннесярэдневяковага ўсходнеславянскага горада. Гістарыяграфічны аналіз праблемы гістарычнай тапаграфіі Полацка мэтазгодна правесці ў праблемна-храналагічнай паслядоўнасці.

Даследаванне Полацка пачалося з вывучэння ў 1928 г. яго гістарычнага цэнтра – першапачатковага гарадзішча, размешчанага на правым беразе р. Палата. Найбольш важныя пытанні ўзнікнення Полацка былі ахарактарызаваны А.М. Ляўданскім. Даследчыку належыць думка, што першапачатковым цэнтрам горада з'яўлялася Полацкае гарадзішча, якое да XII ст. выконвала ролю дзядзінца. Найбольш ранніія матэрыялы напластаванняў помніка гісторык звязаў з ляпной керамікай VIII–X стст. Звяртаючы ўвагу на акалічнасць складвання Полацка ў ранні дагарадскі перыяд, А.М. Ляўданскі акрэсліў тапаграфічнае прызначэнне полацкага гарадзішча як першапачатковага цэнтра горада, які выконваў сваю ролю да XII стст. Распачаўшы археалагічнае вывучэнне Полацка, А.М. Ляўданскі атрымаў важныя высновы аб узнікненні горада, якія і сёння захоўваюць сваю актуальнасць.

Пасля 1928 г. археалагічныя работы на гарадзішчы доўгі час не працягваліся. Археалагічным даследаваннем Полацка ў 1960–1968 гг. займаўся Г.В. Штыхаў, які выканаў прарэзку вала гарадзішча і вызначыў, што найбольш раннія матэрыялы адносяцца да VIII–IX стст.. Апе неабходна зазначыць, што адзінкавасць знаходак VIII–IX стст. на гарадзішчы наўрад можа ўпэўніць у верагоднасці афармлення адзначанага прамежку ніжэйшымі храналагічнымі межамі існавання Полацка. Больш слушным уяўляецца сцвярджэнне навукоўца аб тым, што Полацк тапаграфічна аформіўся ў IX – першай палове X ст. і абмяжоўваўся гарадзішчам і селішчам.

БИБЛИОТЕКА БГПУ
инв. № 1747643

Вывучэннем Полацкага гарадзішча ў 1989 г. займаўся С.В. Тарасаў, які сцвярджае, што ў выніку паступовага спынення жыццядзейнасці на гарадзішчы ў сярэдзіне XI ст. адбылося «перанясенне» дзядзінца горада на правы бераг Заходняй Дзвіны [1]. У сваіх апошніх працах гісторык удакладняе, што «перанясенне» магло адбыцца ў 50–60-я гг. XI ст., калі пачалося будаўніцтва Полацкай Сафіі. Думка аб «пераносе» дзядзінца Полацка выглядае цікавай, але патрабуе істотных доказаў. На наш погляд, праблема «пераносу» дзядзінца Полацка адносіцца да ліку нявырашаных пытанняў і таму важным становіцца вывучэнне разнастайных археалагічных матэрыялаў як з гарадзішча, так і з Верхняга замка.

У 2007 г. археалагічным вывучэннем гарадзішча займаўся Д.У. Дук. Абапіраючыся на спецыфічныя археалагічныя матэрыялы, навуковец распрацаваў асабістую версію прызначэння і ролі Полацкага гарадзішча. На думку аўтара, яно з'яўлялася надзейным і адзіным месцам пражывання княжацкай адміністрацыі да канца XIII ст. Цікавым з'яўляецца сцвярджэнне навукоўца аб размяшчэнні на Полацкім гарадзішчы царквы XII ст. Тым самым навуковец высветліў, што старажытнае гарадзішча з'яўлялася добра ўмацаваным ваенна-адміністрацыйным цэнтрам. Па падліках археолага, гарадзішча займала плошчу ў 2 га. Між тым, яшчэ ў 2002 г., да раскопак на гарадзішчы, Д.У. Дук прапанаваў альтэрнатыву Полацкаму гарадзішчу як умацаванаму цэнтру горада [2]. Радыевугляроднае датаванне арганічных рэчываў з мацерыковай ямы (660–780 гг.) і тыпалагічнае датаванне ляпной керамікі дазволіла Д.У. Дуку выказаць думку, што старажытнымі жыхарамі гарадзішча былі носьбіты культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў [3, с. 24–27].

З мэтай высвятлення больш дакладных храналагічных межаў узнікнення Полацка ў 2009 г. для абследавання гарадзішча была арганізавана экспедыцыя ў складзе М.В. Клімава і П.М. Кенькі. Выяўленне слоя пажарышча, у які трапілі фрагменты дырхемаў, дазволіла навукоўцам унесці дадатковыя звесткі ў праблему пачатковай гісторыі горада. На погляд М.В. Клімава, манеты маглі знаходзіцца ў абароце на працягу 820–840 гг. і захоўвацца ў драўляных пабудовах, якія аказаліся ў вогнішчы [4, с. 6].

Гістарыяграфічнае асэнсаванне ролі Верхняга замка Полацка ў складванні тэрытарыяльнай структуры немагчыма без ўзважанага аналізу поглядаў навукоўцаў на праблему тапаграфічнай стркутры Полацка. Шурфоўка пляцоўкі Верхняга замка, якая была зроблена А.М. Ляўданскім у 1928 г., не дазволіла яму атрымаць інфармацыю аб існаванні тут умацаванага гарадзішча. Пры гэтым навуковец недакладна суаднёс час узвядзення Сафійскага сабора з культурнымі напластаваннямі XI–XII стст. А.М. Ляўданскі выказаў меркаванне аб магчымасці знаходжання на тэрыторыі Верхняга замка селішча.

Вывучэнне Полацка было працягнута ў 1957 г. раскопкамі на Верхнім замку. Аб'ектам даследавання была абрана частка будаўнічага катлавана пад анкалагічны дыспансер. Тады М.К. Каргерам была выказана цікавая думка, што даследаванні паўднёвага ўчастка раскопу натрапілі на драўляныя збудаванні. Зыходзячы з іх асаблівасцей М.К. Каргер выказаў меркаванне, што яны ўяўляюць сабой унутрывальныя канструкц. У 1958 г. пачала сваю дзейнасць археалагічная экспедыцыя пад кіраўніцтвам А.Г. Мітрафанава. Па назіраннях навукоўца, на месцы размяшчэння Сафійскага сабору да пачатку яго будаўніцтва адсутнічаў культурны слой. Так, паступова пачаў замацоўвацца погляд, згодна з якім першапачатковым умацаваным цэнтрам Полацка з'яўлялася гарадзішча на правым беразе Палаты (А.М. Ляўданскі).

На працягу 1959–1962 гг. археалагічныя работы на тэрыторыі ўсходняй часткі Верхняга замка праводзіў Г.В. Штыхаў. Па меркаванні даследчыка, дадзены ўчастак пачаў засяляцца ў канцы X ст. Падобны погляд развіваў і В.Р. Тарасенка (1961–1962 гг.), які адзначыў, што першапачатковае пасяленне Верхняга замка неабходна адносіць да X ст. Развіваючы ўяўленні расійскіх навукоўцаў, В.Р. Тарасенка абмежаваў узвядзенне ўмацаванняў Верхняга замка X–XI стст. Так, у выніку першых археалагічных даследаванняў Верхняга замка навукоўцамі была атрымана інфармацыя аб часе ўзнікнення і характары першапачатковага пасялення на Верхнім замку.

На нашу думку, сцвярджэнне С.В. Тарасава аб тым, што Верхні замак Полацка стаў выконваць ролю дзядзінца не раней, чым за 50-я гг. XI ст., патрабуе ўдакладнення. З падобнай трактоўкай праблемы ў 1960-я гг. выступіў В.Р. Тарасенка. Па меркаванні С.В. Тарасава, тэрыторыяй першапачатковага месцазнаходжання ўмацаванага цэнтра Верхняга замка з'яўлялася яго заходняя частка. Гісторык прытрымліваецца тэзісу аб пашырэнні тэрыторыі Верхняга замка праз уключэнне ў яго склад часткі Вялікага пасада [5, с. 303].

У сваю чаргу, Д.У. Дук схільны лічыць, што Верхні замак быў абмежаваны пасадскай тэрыторыяй і не ўключаў магутных абарончых умацаванняў, а функцыі дзядзінца пачаў выконваць з XIV ст. Асноватворнай ідэяй гісторыка стала яго сцвярджэнне, што Верхні замак Полацка з'яўляўся сакральным і адміністрацыйна-цырыманіяльным цэнтрам [6, с. 27]. Мы лічым, што выконванне Верхнім замкам такой ролі павінна было прадугледжваць ім забеспячэнне яго абарончай здольнасці. Для абаснавання дадзенага сцвярджэння даследчык звяртае ўвагу на сакральны характар сутокаў рэк (Дзвіны і Палаты). У гісторыі Беларусі вядомы выпадкі, калі цэнтры гарадоў узнікалі ў месцах скрыжаванняў рэк. Аднак, не заўсёды ўяўляецца магчымым

археалагічна выявіць сляды сакральнасці (свяцілішча, капішчы) ў такіх месцах. Як нам уяўляецца, роля Верхняга замка не абмяжоўвалася выконваннем ім рэлігійна-цыраманіяльнай і адміністратыўнай функцыяй, а была звязана з геастратэгічным размяшчэннем цэнтра.

Гісторыя вывучэння пасадаў Полацка па сваіх маштабах, па ступені сістэматызацыі археалагічных матэрыялаў і іх адлюстраванні ў навуковай літаратуры адрозніваецца ад большасці гарадоў Беларусі. Выключэнне складае гісторыя археалагічнага даследавання Віцебска.

Упершыню на існаванне слядоў культурнага слоя ў Запалоцці звярнуў увагу А.М. Ляўданскі, які зазначыў факт існавання тут селішча [7, с. 168–172]. Тым самым даследчык вызначыў частку першапачатковай тэрыторыі пасада горада. Але неабходна зазначыць, што выяўленнем пасадскай тэрыторыі навуковец яшчэ не займаўся.

Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі будучага Ніжняга замка дазволілі атрымаць важныя звесткі аб часе і працэсе яго фарміравання. Фрагменты ляпной керамікі, выяўленыя Л.Д. Побалем у 1959 г. на месцы Ніжняга замка, дазволілі яму выказаць думку аб размяшчэнні тут пасада ў XI–XIII стст. У выніку археалагічных работ 1962, 1964 гг. на Ніжнім замку Г.В. Штыхаў высветліў, што найбольш раннія матэрыялы пасялення адносіліся да XI ст. [8, с. 28–29]. Фрагменты керамічнага матэрыялу X–XI стст. былі выяўлены навукоўцам на мысе Палаты за межамі Ніжняга замка. Так, відавочным стала прызнанне факту існавання першапачатковага пасялення на тэрыторыі будучага Ніжняга замка, якое ўзнікла ў XI ст. Сляды керамічнага матэрыялу X–XI стст. былі выяўлены навукоўцам на мысу Палаты за межамі Ніжняга замку.

На правым беразе Палаты Г.В. Штыхавым была закладзена траншэя і вынайдзена кераміка X–XII стст. Тым самым побач з гарадзішчам гісторыкам было выяўлена селішча. На левым беразе Палаты навукоўцам быў закладзены шурф і выяўлены чарапкі дамангольскага часу і фрагмент сасуда X ст. Даследчык прыйшоў да высновы, што абодва берагі Палаты былі заселены ў X–XIII стст. Археалагічныя работы на берагах Палаты і правым беразе Заходняй Дзвіны дазволілі Г.В. Штыхаву вызначыць зону распаўсюджання Вялікага пасада і засведчыць наяўнасць культурнага слоя XI– XIII стст. на Запалоцкім пасадзе [8 с. 31]. Агульная колькасць пасяленняў Полацка, на думку Г.В. Штыхава, у X–XIстст. складала не менш за 7–8. Займаючыся пытаннямі гістарычнай тапаграфіі Полацка, Г.В. Штыхаў не выключае, што «перанясенне» гарадскіх умацаванняў на Верхні замак паўплывала на развіццё Вялікага пасада ўздоўж правага берага Заходняй Дзвіны і ў паўднёва-ўсходнім напрамку ад новага дзядзінца.

Падчас даследаванняў 1978–1980 гг. селішча ў Запалоцці Г.В. Штыхаў выявіў тут фрагменты ляпной керамікі, якая была ім датавана VIII–IX стст. Тым самым гісторык перакананы ў тым, што ніжэйшыя культурныя напластаванні першапачатковага гарадзішча і селішча звязаны з фрагментамі керамікі VIII–IX стст. [9, с. 154–156]. З падобнай трактоўкай стратыграфічнага аналізу не пагаджаецца М.А. Плавінскі, які мяркуе, што ляпная кераміка гарадзішча, Ніжняга замка і селішча можа быць вызначана першай паловай X ст.

Характарызуючы тапаграфічную структуру Полацка, Г.В. Штыхаў зрабіў спробу вызначыць месцазнаходжанне курганага могільніку. Прываблівае ўвагу імкненне даследчыка рэканструяваць памеры плошчаў гарадзішча, селішча, Вялікага пасада і Запалоцця. Па меркаванні гісторыка, агульная плошча горада ў XI –XII стст. складала 80 га [8, с. 32].

У адпаведнасці з поглядамі С.В. Тарасава, тапаграфічную структуру Полацка да пачатку XI ст. складалі ўмацаваны дзядзінец, паселішча-пасад і селішча на правым беразе Палаты. Дадатковыя даследаванні Вялікага пасада і Запалоцця дазволілі С.В. Тарасаву перагледзець выснову Г.В. Штыхава аб памерах тэрыторыі Полацка ў канцы XI–XII стст. Навукоўцам высветлена, што ў XI ст. горад пашырыўся болей, чым у пяць разоў, а ў XII–XIII стст. дасягнуў 120 га. Неабходна падкрэсліць, што заслугай С.В. Тарасава з'яўляецца выяўленне ім тэндэнцыі тэрытарыяльнага пашырэння Полацка ў асобныя стагоддзі. Па падліках гісторыка, плошча Вялікага пасада ў XI ст. складала 20 га, а ў канцы XIIIст. – 56 га. Запалоцкі пасад у XII–XIIIстст., на думку С.В. Тарасава, займаў плошчу 17 га і меў абарончыя збудаванні [5, с. 508].

Высвятленне пытанняў тапаграфіі пасадскай тэрыторыі Полацка, этапаў яе развіцця ў многім стала прадуктыўным дзякуючы раскопкам С.В. Тарасава ў 1987–1988 гг. і Д.У. Дука ў 2002 г. на плошчы Свабоды, падчас якіх гісторыкамі былі ўскрыты рэшткі абарончай сцяны XI ст. . Дзякуючы адкрыццю пасадскіх умацаванняў, навукоўцы тады вырашылі, што яны маюць справу з часткай тэрыторыі Вялікага пасада. Але неабходна зазначыць, што ў сваёй апошняй працы Д.У. Дук перагледзеў ранейшае меркаванне і зазначае, што ўскрытыя фрагменты ўмацаванняў сярэдзіны XI ст. не мелі дачынення да Вялікага пасада, які ў адзначаны час пачаў фарміравацца. Даследуемая сцяна, на думку навукоўца, мела дачыненне да вакольнага горада Полацка.

У цэлым, неабходна падкрэсліць, што ў апошнія гады стала надавацца больш увагі праблемам узнікнення і фарміравання Полацка. Так, Д.У. Дукам упершыню былі разгледжаны такія пытанні, як дынаміка

сацыяльнай тапаграфіі і развіцця тэрытарыяльнай структуры па стагоддзях. У прыватнасці, гісторыку належыць найбольш пераканаўчая спроба доказу існавання Полацка ў канцы VIII ст. і яго вакольнага горада ў канцы X – першай палове XI ст. Так, даследчык не выключае сапраўднасці факта існавання «малога пасада» Полацка ў ранні перыяд і яго размяшчэння на поўдні ад першапачатковага гарадзішча. Вартасць даследаванняў Д.У. Дука заснавана на адкрыцці неўмацаваных селішчаў-перадграддзяў на правым беразе Палаты, комплексным вывучэнні левабярэжных пасадаў Заходняй Дзвіны. Тым самым Д.У. Дук высветліў, што для Полацка характэрным было фарміраванне пасадаў сінхронна часу існавання гарадзішча, калі першапачатковая тапаграфія развівалася па веерна-радыяльнай схеме. Але, на наш погляд, разам з гарадзішчам пачалі фарміравацца не самі пасады, а іх папярэднікі – селішчы, якія ў далейшым пачалі пераўтварацца ў пасады.

Важным дасягненнем айчынных навукоўцаў стала адкрыццё культурных напластаванняў на левым беразе Дзвіны. Даследаванне Вострава пачалося з пошукаў слядоў манастыра Іаана Прадцечы. Так, у 1959 г. Л.Д. Побалем ва ўсходняй частцы Вострава былі выяўлены кавалкі плінфы. Раскопкамі Г.В. Штыхава ў 1963 г. ва ўсходняй частцы Вострава былі выяўлены абломкі плінфаў і гаршкоў XI–XIII стст. У акрэсленым участку С.В. Тарасавым была зроблена шурфоўка і адзначана магчымасць засялення дадзенай тэрыторыі ў XI ст. З мэтай новага пошуку манастыра ў 1996 г. М.В. Клімавым вывучаўся ўсходні участак Вострава. У выніку даследчык засведчыў тут наяўнасць керамічнага матэрыялу XI–XII стст. і фрагментаў плінфы.

У 2009 г. археалагічнымі раскопкамі Д.У. Дука была ахоплена тэрыторыя Слабады і Крыўцова пасада. Мэтазгодна пагадзіцца з меркаваннем навукоўца, што найбольш спрыяльным месцам для засваення ў X–XIIIстст. была тая частка, якая прылягала да вусця р. Бельчыца. Патрабуе свайго асэнсавання факт адсутнасці культурных напластаванняў адзначанага часу на тэрыторыі Крыўцова пасада. На нашу думку, на дадзены момант не прыведзены важкія доказы для аднясення левабярэжжа Дзвіны да пасадскай тэрыторыі ў адзначаны час. Ёсць толькі падставы сцвярджаць аб яго засяленні.

Багацце гістарыяграфічнай спадчыны і адкрыцці даследчыкаў складаюць неад'емны кампанент гісторыі археалагічных даследаванняў Полацка. У сваю чаргу, важнае значэнне набывае аб'ектыўнае ацэньванне тых пытанняў, якія знаходзілі розныя тлумачэнні гісторыкаў. Да іх мы адносім храналагічныя межы ніжэйшых культурных напластаванняў дзядзінца Полацка (першапачатковага гарадзішча), «перанясенне» дзядзінца Полацка ў вусце Заходняй Дзвіны, прызначэнне Верхняга замка ў IX–XIII стст. і гарадзішча ў VIII–XIV стст., фарміраванне вакольнага горада на аснове паселішча.

### БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Тарасаў, С. В. Да пытання аб тапаграфіі Полацка IX–XI стст. / С. В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 21–23 крас. 1997 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Полац. Гіст.культ. музей-запаведнік, Полац. дзярж. ун-т ; уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1998. – С. 299–304.
2. Дук, Д. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25–31.
3. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010 – 180 с.
4. Клімаў, М. В. Новае адкрыццё ў хранапогіі старажытнага Полацка / М. В. Клімаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 5. – С. 5–7.
5. Тарасаў, С. В. Да пытання аб тапаграфіі Полацка IX–XI стст. / С. В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 21–23 крас. 1997 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Полац. Гіст.культ. музей-запаведнік, Полац. дзярж. ун-т ; укпад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1998. – С. 299–304.
6. Дук, Д. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25–31.
7. Ляўданскі, А. М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А. М. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. – Менск, 1930. – Кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі, т. 2. – С. 157–198.
8. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 135 с.
9. Штыхаў, Г. В. Новыя раскопкі ў Полацку / Г.В. Штыхаў // Помнікі старажытна-беларускай культуры : Новыя адкрыцці : зб. арт. / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш.]. – Мінск, 1984. – С. 154–156.